# ЗАДАННІ
## Завочнага каманднага тура

**Каманда павінна прадставіць у Арганізацыйны камітэт рашэнні задач па вызначанай форме. Два заданні (на выбар каманды) прадстаўляюцца на беларускай мове (дадатковае заданне на веданне беларускай прафесійнай юрыдычнай лексікі).**

## ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

Канцэпцыі развіцця беларускага заканадаўства і іх уплыў на нацыянальную прававую сістэму.

## КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПРАВА. АДМІНІСТРАТЫЎНАЕ ПРАВА

Заканадаўчае забеспячэнне роўнасці дзяржаўных моў.

# ГРАМАДЗЯНСКАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС, ГАСПАДАРЧАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС

ААТ «Першы залогавы банк» (далей – Банк) на падставе крэдытнага дагавору ад 23 красавіка 2009 г. выдаў ТАА «Россач» крэдыт у памеры 1,2 млрд рублёў на 2 гады з выплатай працэнтаў за карыстанне крэдытам па стаўцы 25 % гадавых. Працэнты за карыстанне крэдытам у адпаведнасці з крэдытным дагаворам падлягалі выплаце штомесячна не пазней апошняй даты каляндарнага месяца, за які ажыццяўляецца выплата.

ТАА «Дамель», якое з'яўляецца адным з удзельнікаў ТАА «Россач», заключыла з Банкам дагавор залогу, згодна з якім ТАА «Дамель» (залогадаўца) дало Банку (залогатрымальніку) у залог у забеспячэнне выканання ТАА «Россач» сваіх абавязацельстваў па крэдытным дагаворы маёмасць (тэхналагічнае абсталяванне), кошт якой згодна з дагаворам залогу быў вызначаны ў 1,4 млрд рублёў.

У сувязі з шматразовай нявыплатай ТАА «Россач» працэнтаў за карыстанне крэдытам Банк 8 лютага 2011 г. накіраваў ТАА «Россач» патрабаванне аб датэрмінавым звароце крэдыту, выплаце нявыплачаных працэнтаў і прадугледжанай крэдытным дагаворам няўстокі за пратэрміноўку выплаты працэнтаў.

На падставе заявы Банка 22 сакавіка 2011 г. гаспадарчы суд г. Мінска вынес вызначэнне аб судовым загадзе аб спагнанні з ТАА «Россач» на карысць Банка запазычанасці па крэдыту, працэнтам і няўстойцы на агульную суму 1,396 млрд рублёў.

У сувязі з адсутнасцю ў ТАА «Россач» грашовых сродкаў і маёмасці для ліквідацыі запазычанасці Банк звярнуўся ў суд з іскам да ТАА «Дамель» аб пагашэнні запазычанасці за кошт закладзенай маёмасці. Рашэннем гаспадарчага суда ад 25 красавіка 2011 г. іскавыя патрабаванні былі задаволеныя і вынесена рашэнне аб накладанні сыскання на прадмет залогу (тэхналагічнае абсталяванне). Пачатковая цана продажу закладзенай маёмасці вызначана судом у памеры 1,5 млрд рублёў. Рашэнне ўступіла ў законную сілу 19 мая 2011 г.

Вызначэннем гаспадарчага суда ад 24 чэрвеня 2011 г. узбуджана справа аб банкруцтве і пачата конкурснае вядзенне ў дачыненні ТАА «Россач» (банкруцтва ліквідуемага даўжніка).

Вызначэннем гаспадарчага суда ад 30 чэрвеня 2011 г. узбуджана справа аб банкруцтве і пачата конкурснае вядзенне ў дачыненні ТАА "Дамель" (банкруцтва ліквідуемага даўжніка).

Банк звярнуўся да антыкрызіснага кіраўніка ТАА «Дамель» з патрабаваннем крэдытора, у якім прасіў антыкрызіснага кіраўніка прызнаць патрабаванні ў суме 1,396 млрд рублёў і ўключыць Банк у рэестр крэдытораў у якасці крэдытора чацвёртай ступені, паколькі яго патрабаванні забяспечаны залогам маёмасці даўжніка.

Антыкрызісны кіраўнік ТАА «Дамель» адмовіў ва ўключэнні Банка ў рэестр патрабаванняў крэдытораў у якасці крэдытора чацвёртай чаргі, але

ўключыў яго ў рэестр патрабаванняў крэдытораў у якасці крэдытора пятай чаргі, пазначыўшы, што на падставе дагавору куплі-продажу ад 11 мая 2011 г. ТАА «Дамель» прадала тэхналагічнае абсталяванне, якое было прадметам залогу, ЗАТ «Валынь», таму патрабаванні Банка да ТАА «Дамель» ужо не забяспечаны залогам.

Банк у парадку арт. 95 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2000 г. «Аб эканамічнай неплацёжаздольнасці (банкруцтве)» звярнуўся ў гаспадарчы суд з пярэчаннямі па выніках разгляду кіраўніком патрабавання крэдытора і прасіў суд абавязаць антыкрызіснага кіраўніка ТАА «Дамель» уключыць яго ў рэестр патрабаванняў крэдытораў у якасці крэдытора чацвёртаай чаргі.

Падчас судовага працэсу пацвердзіліся факт заключэння 11 мая 2011 г. дагавору куплі-продажу абсталявання, якое было прадметам залогу, паміж ТАА «Дамель» (прадавец) і ЗАТ «Валынь», а таксама факт перадачы ў гэты ж дзень прададзенай маёмасці пакупніку.

## Заданне

Дайце разгорнутую прававую кваліфікацыю сітуацыі. Што павінен зрабіць суд пры разглядзе патрабавання Банка?

# КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА І КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Дырэктар камерцыйнай арганізацыі Г.І. Варанцова пасля правалу шэрагу здзелак прыйшла да высновы, што камерцыйная інфармацыя яе кампаніі становіцца вядомай канкурэнтам. Яна даручыла ўнутранай службе бяспекі ўстанавіць ва ўсіх памяшканнях, у тым ліку ў холе, пад выглядам супрацьпажарнага абсталявання падслухоўваючыя прыстасаванні і адсочваць усе размовы супрацоўнікаў, выяўляючы нелаяльныя і падазроныя. Праз месяц начальнік службы бяспекі А.Д. Канстанцінаў прадставіў дырэктару відэаматэрыялы, з якіх было бачна, што начальнік аддзела па забяспячэнні В.А. Сініцына тройчы ў працоўны і непрацоўны час у розных памяшканнях арганізацыі ўступала ў інтымную сувязь з памочнікам дырэктара па асабістых даручэннях А.Ю. Гарэлавым. Намеснік дырэктара па кадрах у прэвентыўных мэтах даручыла размясціць матэрыялы на форуме, які даступны толькі для супрацоўнікаў кампаніі.

У выніку 10-гадовая дачка А.Ю. Гарэлава, якой на электронную пошту нехта з супрацоўнікаў кампаніі даслаў адпаведныя матэрыялы, папала ў бальніцу з цяжкім неўрозам (лячылася стацыянарна 7 тыдняў), а жаніх В.А. Сініцынай адмовіўся рэгістраваць шлюб (вяселле магло б адбыцца праз тры тыдні пасля публікацыі матэрыялаў).

Дайце разгорнутую прававую адзнаку казуса.